зіны XVIII ст. супраць польскіх прыгнятальнікаў, якімі кіраваў ураджэнец в. Селішча Хоцімшчыны Васіль Вашчыла. Ды сялянскія атрады былі разбіты чужынцамі. Вашчыла праз Альшоўскі фарпост (малая радзіма П. Прыходзькі) перайшоў на тэрыторыю Расіі. Ёсць звесткі, што праз гэты ж фарпост у свой час праходзіў і Емяльян Пугачоў. У Альшове ад тых часоў захаваліся 300-гадовыя дуб і лістоўніца. Музей багаты звесткамі пра Хоцімшчыну XX стагоддзя: хацімчане ў рэвалюцыі 1905 і 1917 гг., першыя камунары Хоцімшчыны (да іх прыязджаў кіраўнік краіны А. Р. Чарвякоў і пахваліў за старанную працу), стварэнне піянерскай і камсамольскай арганізацый, першыя калгасы, дэлегаты з'ездаў Саветаў. Бадай, самы змястоўны раздзел музея пра Вялікую Айчынную вайну. Ды і не дзіва: невялікая па плошчы і насельніцтву Хоцімшчына дала краіне 1 адмірала і 7 ге-

абвешчаны чалавекам Свету 2000 года. Падарыў музею кнігі і цікавыя архіўныя дакументы;

– Ф. П. Каралёў – доктар педагагічных навук, прафесар, рэдактар часопіса «Савецкая педагогіка»;

– І.З. Сурто – адзін са стваральнікаў сістэмы аховы здароўя ў краіне, акадэмік, быў прэзідэнтам АН Беларусі;

– дактары фізіка-матэматычных навук, браты Леўшанкі – Барыс (мой былы аднакласнік па Хоцімскай СШ № 1) і Валерый; навукоўцы У.В. Анічэнка, М.І. Базылеў, Н.В. Ерашова, П. Піўчанка, А. Сямашчанка і інш.

– літаратары - А. Зарыцкі, М. Карпенка, П. Прыходзька, лёсам звязаны з Хоцімскам А. Адамовіч, К. Кірэенка, А. Куляшоў (яго маці Кацярына Ратабыльская была маёй настаўніцай, з мужам Аляксандрам Куляшовым пахаваны на могілках Хоцімска).

Музей жыве і працуе, папаўняецца новымі экспанатамі. Настаяцель суседняга са школай Храма Святой

дабрыні і міласэрнасці, цікавасці да мінулага, прыгожага, актыўнага ўдзелу ў грамадскіх справах. Музейны фонд паспяхова выкарыстоўваецца ў вучэбна-метадычнай і выхаваўчай рабоце пры напісанні школьных сачыненняў на тэмы: «Апісанне помніка», «Мне расказалі пра вайну...», «Навекі ў памяці народа» і інш. Па матэрыялах музея ладзяцца тэматычныя ўрокі мужнасці, пішуцца даследчыя работы, якія прывучаюць школьнікаў беражлівым адносінам да працоўных і ратных традыцый бацькоў і дзядоў, сваёй вучобай і працай захоўваць і прымнажаць іх. Пры музеі дзейнічае гурток «Юны краязнаўца». Для многіх ён стаў школай творчай працы і актыўнага пошуку. Нездарма нашы гурткоўцы займаюць прызавыя месцы ў розных творчых конкурсах і алімпіядах раённага, абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Удзельнік міжнароднай канферэнцыі па гісторыі Халакоста (тэма: «Халакост. Памяць па-

інш.

...Такая яна – Валянціна Іванаўна Баурына – абаяльная дзівосная жанчына, Чалавек і Настаўнік, няўрымслівая руплівіца і берагіня духоўнай культуры, спадчыны Прыбеседдзя. Нездарма яе дабрачынная падзвіжніцкая дзейнасць адзначана многімі дыпломамі і Ганаровымі граматамі Хоцімскага раённага, Магілёўскага абласнога ўпраўленняў адукацыі і культуры, Міністэрстваў адукацыі і абароны РБ. За актыўны пошук абаронцаў Радзімы, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну 1941-1945 гг., начальнікам ваенна-мемарыяльнага цэнтра Узброеных Сіл РФ яна ганаравана прыгожым нагрудным знакам «За актыўны пошук». Упэўнены: «Пакуль ёсць т а к і я людзі, не памрэ – будзе жыць Беларусь»!...

**Леанід РАМАНЕНКА,**
**выпускнік Хоцімскай СШ №1,**
**1953 года,**
**выдатнік адукацыі РБ.**

**Раманенка, Л.** Узнагароджана Знакам “За актыўны пошук” : [ пра ўзнагароду В. Баурынай ] / Леанід Раманенка // Шлях Кастрычніка. — 2007. — 18 ліпеня. — С. 3.